«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Ад 2 гадоў "хіміі" да 8 гадоў калоніі. У Бабруйску вынеслі прысуд па справе аб падпале "Табакеркі"

07.06.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



У судзе Бабруйска. Фота "Вячэрні Бабруйск"

У судзе Бабруйскага раёна і горада Бабруйска 7 чэрвеня агучылі прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да жыхароў горада Аляксандра Назаровіча, Аляксандра Мар'ясава, Аляксандра Гаўрылава і Віталя Васілевіча.

Нагадаем, мужчын вінавацілі па шэрагу артыкулаў за дзеянні ў кастрычніку 2020 года: спыненне таварнага цягніка (ч. 1 арт. 342 КК), нанясенне чырвоных палос на трох белых рэкламных лайтбоксах (арт. 341 КК), пракол колаў у аўтамабіля супрацоўніка міліцыі (ч. 3 арт. 339 КК), падпал "Табакеркі" (ч. 3 арт. 218 КК), а таксама за неданясенне

аб дакладна вядомым цяжкім ці асабліва цяжкім злачынстве (ч. 2 арт. 406) і дзеянні з прадметамі на аснове выкарыстання гаручых рэчываў (ч. 2 арт. 295-3).

Усе чацвёра абвінавачаныя тлумачылі свае дзеянні пратэстам супраць сітуацыі ў краіне пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня, а менавіта беспадстаўных затрыманняў і катаванняў людзей з боку сілавікоў.

У судзе фігуранты справы заявілі, што раскайваюцца ў тым, што здзейснілі. Таксама яны распавялі, што **пасля затрымання і дастаўкі ва УУС ноччу 10 кастрычніка іх збівалі некалькі гадзін, прымушаючы зрабіць прызнанні на відэакамеру**.

На папярэднім пасяджэнні дзяржабвінаваўца **Наталля Лосева** запрасіла пазбаўленне волі для Аляксандра Назаровіча тэрмінам на 9 гадоў ва ўмовах узмоцненнага рэжыму тэрмінам, для Аляксандра Мар'ясава і Віталя Васілевіча - на 8 гадоў ва ўмовах узмоцненнага рэжыму, а для Аляксандра Гаўрылава - на 2 гады ва ўмовах агульнага рэжыму.

7 чэрвеня суддзя Дзмітрый Крэнжыеўскі агучыў прысуд.

Абвінавачанаму **Аляксандру Назаровічу** прызначыць пакаранне па:

- ч. 2 арт. 339 КК – пазбаўленне волі на тэрмін 2 гады
- ч. 3 арт. 339 КК – пазбаўленне волі на тэрмін 4 гады
- ч. 1 арт. 342 КК – пазбаўленне волі на тэрмін 1 год
- ч. 6 арт. 16 арт. 341 КК – арышт на тэрмін 1 месяц
- ч. 2 арт. 295-3 КК – пазбаўленне волі на тэрмін 3 гады
- ч. 1 арт. 14 ч. 3 арт. 218 КК – пазбаўленне волі на тэрмін 8 гадоў

Канчаткова прызначыць **Аляксандру Назаровічу** пакаранне ў выглядзе **пазбаўлення волі на тэрмін 8 гадоў з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах ўзмоцненага рэжыму**. Таксама **канфіскаваць яго аўтамабіль** Opel Astra.

Абвінавачаным **Віталю Васілевічу** і **Аляксандру Мар'ясаву** прызначыць пакаранне па:

- ч. 1 арт. 342 КК – пазбаўленне волі на тэрмін 1 год
- ч. 6 арт. 16 арт. 341 КК – арышт на тэрмін 1 месяц
- ч. 2 арт. 295-3 КК – пазбаўленне волі на тэрмін 3 гады
- ч. 3 арт. 339 КК – пазбаўленне волі на тэрмін 3 гады і 6 месяцаў

- ч. 1 арт. 14 ч. 3 арт. 218 КК – пазбаўленне волі на тэрмін 7 гадоў і 6 месяцаў

Канчаткова прызначыць **Віталю Васілевічу** і **Аляксандру Мар'ясаву** пакаранне ў выглядзе **пазбаўлення волі на тэрмін 7 гадоў і 6 месяцаў з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму**

Абвінавачанаму **Аляксандру Гаўрылаву** прызначыць пакаранне па:

- ч. 2 арт. 406 КК – абмежаванне волі з накіраваннем у ПУАТ на тэрмін 1 год
- арт. 341 КК – арышт на тэрмін 2 месяцы
- ч. 2 арт. 339 КК – абмежаванне волі з накіраваннем у ПУАТ на тэрмін 2 гады

Канчаткова прызначыць **Аляксандру Гаўрылаву** пакаранне ў выглядзе **абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу на тэрмін 2 гады**.




У Бабруйску судзяць чацвярых мужчын за падпал "Табакеркі", спыненне таварнага цягніка і прабітыя колы ў аўтамабіля

Памочнік пракурора Наталля Лосева заявіла, што віна чатырох бабруйчан цалкам даказаная, аднак абвінавачаныя з такой трактоўкай не згодныя. Падчас допыту ў судзе яны патлумачылі свае дзеянні па кожнаму эпізоду.

Опубликовать






СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

У Мінску асудзілі Алену Церашкову, двухразовую чэмпіёнку Беларусі па тэквандо, пісьменніцу і хірургіню

За ўдзел у акцыі пратэсту ў Мінску асудзілі палітзняволеную Галіну Лагацкую (дапоўнена)

У Жлобіне за тыдзень – тры суды за ўдзел у акцыях пратэсту ў 2020 годзе

"З мэтай вядзення дэструктыўнай дзейнасці". За ўдзел у акцыях пратэсту асудзілі двух братоў і жонку аднаго з іх



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 23 траўня па 14 чэрвеня


Гісторыя аднаго зварота. Як дзве жанчыны абаранілі свае правы

"Як захаваць сябе ў час працяглага зняволення?" Адкрыты запіс падкаста "Вясна прыйдзе" ў Дзень палітвязняў Беларусі

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Пяць гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах строгага рэжыму і вялізны штраф: прысуд праваабаронцу Леаніду Судаленку

Затрыманне, спецвытворчасць, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 21 чэрвеня

У Мінску асудзілі Алену Церашкову, двухразовую чэмпіёнку Беларусі па тэквандо, пісьменніцу і хірургіню

Ліквідацыя грамадскіх арганізацый, новыя затрыманні: хроніка пераследу 20 чэрвеня (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 17 чалавек палітычнымі зняволенымі

Франаку Вячорку прызначылі 20 гадоў пазбаўлення волі

Магілёўскую керамістку асудзілі на 1,5 года калоніі за перасланае


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024





ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

VOICE OF BELARUS

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

